

ЯК СЕЗОННЫЯ МАХЛЯРЫ ЗНАХОДЗЯЦЬ АХВЯР 5

100 ДЗЁН СТАРШЫНІ СЕЛЬСКАГА САВЕТА МС




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

23 ЛІСТАПАДА 2018 г.
ПЯТНІЦА
№ 226 (28842)


9-24 стар. МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ +TV ПРАГРАМА

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Максім РЫЖАНКОЎ, першы намеснік кіраўніка Адміністрацыі Прэзідэнта** *(па выніках выязнога прыёму грамадзян у Мазыры):*

*«Былі агучаны праблемы, якія мясцовыя ўлады маглі вырашыць на сваім узроўні, праявіўшы больш чалавечага падыходу да людзей. Гэта датычыцца не толькі аднаго канкрэтнага раёна. У прыватнасці, гэта тэмы газазабеспячэння, афармлення дакументаў на зямлю і нерухомасць у сельскай мясцовасці. Па такога роду пытаннях мясцовыя ўлады могуць знайсці магчымасць зрабіць крыху больш, чым прадпісана ў кагосьці ў функцыянальных абавязках, асабліва калі гэта датычыцца пенсіянераў, ветэранаў або інвалідаў».*

# ЗЯЛЁНАЯ АСВЕТА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Вучаніцы малодшых класаў Германавіцкай школы Шаркаўшчынскага раёна на занятках у экалагічным класе. Заняткі праводзіць грамадскі эколаг, настаўнік біялогіі і геаграфіі і кіраўнік школьнага экалагічнага клуба Марына ФЁДАРАВА.

## КОРАТКА

- **Зборка турбаагрэгата пачалася ў машынным зале другога энергаблока БелАЭС.**
- Адзіны тарыф на электрычную энергію для насельніцтва плануецца ўвесці ў Беларусі ў 2019 годзе.
- **Усе беларускія аптэкі падключацца да сістэмы электроннага рэцэпта да канца года.**



- Беларускія хакеісты не будуць лічыцца легіянерамі ў расійскіх клубах КХЛ.
- **Канцэрн «Белнафтахім» праводзіць апытанне насельніцтва для вызначэння далейшай стратэгіі змянення цэн на аўтамабільнае паліва.**

Занятасць

# «СТАЛОВАЯ Ў ВАС ЁСЦЬ?»

### Як мінчане шукалі работу на кірмашы вакансій

**«Нашы мужчыны едуць у Расію на зароботкі, а потым плачуць, што ў працоўнай кніжцы запісу няма. А нам аддзелачнікі вельмі патрэбны!» — кажа кадравік мінскага будаўнічага прадпрыемства. Больш за 100 арганізацый сабраў учора ў сталіцы агульнагарадскі кірмаш вакансій. Чаго шукалі наймальнікі і што чакаюць ад работы саіскальнікі — у нашым рэпартажы.**

СТАР. 2




Фота Ганна ЗАНКАВІЧ.

Сітуацыя

# З кватэранаймальніка — у бяздомныя



Фота Андрэя САЗОНАВА.

**Калі не плаціць «камуналку», можна апынуцца на вуліцы. І гэта не міф**

**Людміле 62. Яна жыве ў аднапакаёвай кватэры, якая аформлена ва ўласнасць не да канца. Тут даўно адключаныя электрычнасць і халодная вада. Каля трох гадоў яна не атрымлівае пенсію, бо згубіла пашпарт, сваякоў не мае. За камунальныя паслугі жанчына вінаватая каля трох тысяч рублёў... Гаспадыня сталічнага жылля, доўг якой блізіцца да 7000 рублёў, ужо два гады як памерла, а доўг застаўся. Кватэра ўвесь гэты час стаіць адамкнёная. Сваякі не спяшаюцца прымаць такую спадчыну, працягваючы жыць у інтэрнаце... Падобных гісторый у «камунальным» жыцці вялікага горада хапае. Але чамусьці злосныя неплацельшчыкі ўпэўненыя, што да крайняй меры — высялення з жылплошчы — ніхто прыбягаць не будзе. А дарэмна. У гэтым давялося пераканацца, прычыніўшыся да аднаго такога высялення ў Першамайскім раёне сталіцы. 46-гадовая Вольга жыла ў арэнднай двухпакаёўцы, за якую завінавацілася дзяржаве амаль 4000 рублёў. Некалькі дзён таму яна пазбавілася сталічнай рэгістрацыі і фактычна апынулася на вуліцы.**

СТАР. 4

ISSN 1990 - 763X


ЗВЯЗДА Да чытача з любоўю!

СЯБРОЎ У НОВЫМ ГОДЗЕ НЕ МЯНЯЮЦЬ!
Ідзе падпіска на «Звязду»
на I квартал і I паўгоддзе 2019 года.

Заставайцеся з намі — будзе цікава!